Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 СНЕЖНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 249 (28107) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

САПРАЎДНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раство Хрыстова 25 снежня

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас з Раством Хрыстовым.

Маральныя і духоўныя арыенціры для многіх пакаленняў нашых продкаў былі сфарміраваны хрысціянскай верай, якая ўвасабляе высокія ідэалы гуманізму, справядлівасці і міласэрнасці. Вялікая ўрачыстасць доўгачаканага свята зноў, як і стагоддзі таму, дорыць радасць і надзею, натхняе на добрыя справы і ўчынкі.

Адклікаючыся на гэты заклік ва ўмовах сучаснай цывілізацыі, мы павінны сумеснымі намаганнямі ўмацоўваць у грамадстве сапраўдныя каштоўнасці і традыцыі, садзейнічаць развіццю адносін міру і добрасуседства.

Сардэчна жадаю вам моцнага здароўя, даўгалецця і працвітання.

Няхай у вашых дамах будуць утульнасць і дастатак, у сем'ях пануюць любоў і ўзаемапавага, у душы будзе мір і шчасце.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:

«Ідзе канчатковае абмеркаванне Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця на 2016—2020 гады. Яна ўвогуле звярстана. Галоўнае, чаму мы павінны надаць увагу, — гэта стварэнне новых працоўных месцаў. Калі першапачаткова гучала лічба 3,5 тысячы працоўных месцаў, то зараз, па папярэдняй ацэнцы, у рамках дзяржпраграмы будзе створана не менш за 10 тысяч. Гэта будуць высокааплатныя месцы на новых вытворчасцях з дабаўленым коштам, вышэйшым за сярэднееўрапейскі, дзе будзе высокі ўзровень тэхналогій і на якіх без добрай адукацыі працаваць немагчыма».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.12.2015 г.

Долар ЗША	18368,00	▼
Еўра	20076,00	▲
Рас. руб.	258,57	▲
Укр. грыўня	800,35	▲

ISSN 1990 - 763X

СВЯТЛО ЛЮБОВІ І НАДЗЕІ

Маленькая мінчанка Марыя Кандаурава ля батлейкі ў Чырвоным касцёле.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БЕЛАРУСЬ, НЕ БОЙСЯ ПРЫНЯЦЬ ХРЫСТА!

Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Божае Нараджэнне

Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць... бо нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан (Лк 2, 10-11).



Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры!

Сардэчна вітаю вас словамі анёла, які абвясціў бэтлеемскім пастушкам аб нараджэнні Збаўцы. Убачыўшы Божага пасланца, яны напалохаліся. З упэўненасцю можна сказаць, што і мы ўчынілі б тое ж, калі б нам з'явіўся анёл. Але Божы пасланец іх супакоіў, кажучы, што ў горадзе Давіда нарадзіўся Збаўца, якога чалавецтва з нецярпеннем чакала.

Тут добра ўспомніць сцэну Звеставання, калі Марыя, пачуўшы, што Бог выбраў Яе ў якасці Маці Збаўцы, таксама напалохалася. Тады арханёл Габрыэль супакойваў Яе словамі: «Не бойся, Марыя, бо знайшла Ты ласку ў Пана. Вось зачнеш ва ўлонні сваім і народзіш Сына, і дасі Яму імя Езус (...), бо для Бога няма нічога немагчымага» (Лк 1, 30-31. 37).

Знамянальна, што сёлетнюю ўрачыстасць Нараджэння Хрыста мы святкуем у Год Божай Міласэрнасці. Прыйсце Божага Сына ў свет у чалавечым вобразе было знакам бязмежнай Божай міласэрнасці да чалавека, якая праяўляецца і далей у паслузе Касцёла і да якой мы ўсе закліканы.

Нараджэнне Езуса ў Бэтлееме больш за 2000 гадоў таму — гэта ўжо гісторыя, хаця вельмі прыгожая і сентыментальная, аднак гісторыя. На ёй мы павінны вучыцца, бо гісторыя з'яўляецца маці-настаўніцай. Нараджэнне ж Хрыста — гістарычная падзея — адначасова з'яўляецца дынамічным працэсам. Хрыстус і сёння нараджаецца ў Касцёле і прыходзіць да нас у Святым Пісанні, сакрамэнтах, перадусім у Эўхарыстыі, прыходзіць у іншай дзейнасці Касцёла, асабліва праз учынкі міласэрнасці.

Ці мы пазнаём Яго? Ці не баімся адчыніць Яму дзверы нашых сэрцаў і дазволіць быць з намі? Ці радуемся Яго прыйсцю? На гэтыя і падобныя пытанні нам неабходна адказаць, бо бяда будзе, калі мы будзем верыць у тое, што Ён нарадзіўся ў Бэтлееме, а сваёй ласкай не нараджаецца ў нашых сэрцах, як казаў вялікі паэт Адам Міцкевіч.

Мы жывём у асаблівы для Касцёла і свету час. З аднаго боку, свет імкнецца спіхнуць хрысціянскую веру на ўзбочыну грамадскага жыцця. З іншага ж — мы бачым шмат знакаў дзеяння Святога Духа. Мы з'яўляемся часткай гісторыі, якая адбываецца на нашых вачах, і, як веруючыя, павінны сваім жыццём і хрысціянскім сведчаннем вызнаваць веру ў Езуса Хрыста, які быў зачаты ад Святога Духа, нарадзіўся з Панны Марыі ў Бэтлееме, быў укрыжаваны, пахаваны, уваскрэс, узышоў на неба і сядзіць праваруч ад Айца.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ПІСЬМЕННІКІ І ЧАС

Сёння ў Мінску працягваецца пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечанае 10-годдзю гэтага творчага аб'яднання. Мерапрыемства стала добрай нагодай пагаварыць аб надзённых праблемах сучаснай літаратуры і аб ролі пісьменнікаў у грамадстве.

А яна, гэта роля, павінна стаць больш прыкметнай. Такую думку выказаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ,** які прысутнічаў на мерапрыемстве і зачытаў віншаванне Прэзідэнта з нагоды 10-годдзя Саюза пісьменнікаў Беларусі.

«Пісьменнікі — гэта не проста людзі, якія пішуць. Гэта людзі думаючыя, запатрабаваныя. Таму трэба надаць асаблівую ўвагу, каб была выбудавана канструктыўная работа, узаемадзеянне пісьменнікаў і грамадства», — сказаў Ігар Бузоўскі.

«Ад пісьменнікаў у многім залежыць духоўна-маральны, культурны складнік. Іх дзейнасць мае каласальнае значэнне, а роля будзе толькі павялічвацца, — лічыць ён. — Асабліва з улікам таго, што наступны год, калі прапанову падтрымаюць, стане Годам культуры ў Беларусі».

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ абазначыў тэму росту і развіцця маладых літаратараў. Ён расказаў, што СПБ засноваў стыпендыю для маладых аўтараў, невялікімі тыражамі выдаюцца творы маладых талентаў. «Калі пачынаючы літаратар трымае ў руках першую кнігу са сваімі вершамі, якое пачуццё гонару і ўдзячнасці ён адчувае. Гэта трэба падтрымліваць, — перакананы Мікалай Чаргінец. — Навучыць пісаць нельга, але падтрымліваць, прапагандаваць, рухаць наперад маладых неабходна».

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ паведаміла, што плануецца арганізаваць маштабны конкурс для маладых літаратараў. «Міністэрства інфармацыі сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі ініцыявалі Нацыянальную літаратурную прэмію. Лічу вельмі важным арганізаваць у краіне паўнацэнны маштабны конкурс для маладых літаратараў. Мы можам аб'яднаць намаганні, не толькі выяўляць таленавітых, але і дапамагаць устаць ім на крыло», — сказала міністр.

Адным з мерапрыемстваў на 23-й Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая адбудзецца 10-14 лютага, стане работа сімпозіума маладых літаратараў.

Паводле слоў Лініі Ананіч, у гэтым годзе больш як Br20 млрд дзяржава змагла накіраваць на падтрымку выдання кніг таленавітых аўтараў. Акрамя перавыдання класікаў беларускай літаратуры, штогод 10-12 кніг сучасных пісьменнікаў выдаюцца і пастаўляюцца ў публічныя бібліятэкі.

Адной з галоўных сумесных задач Лілія Ананіч лічыць выхаванне ў грамадстве не толькі павагі да кнігі, але развіццё патрэбы ў яе чытанні. І важна выпрацоўваць новыя падыходы ў рэалізацыі гэтай задачы, улічваць, што сёння кніга мае не толькі папяровую форму, але і электронную.

Кіраўнік Мінінфарма таксама падкрэсліла, што беларуская кніга годна прадстаўлена і на міжнародных выставах, і на іншых міжнародных пляцоўках. У прыватнасці, яна адзначыла актыўную работу беларускіх пісьменнікаў на Дні культуры Беларусі ў Туркменістане.

■ Парламенцкі дзённік

ВІДЭАКАНФЕРЭНЦЫЯ З РЭГІЁНАМІ

Менавіта такім чынам у найбліжэйшы панядзелак, 28 снежня, адбудзецца чарговае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

У ім возьмуць удзел як прадстаўнікі дзяржаўных структур, так і кіраўнікі прадпрыемстваў рэгіёнаў. Удзельнікі абмяркуюць пытанні занятасці, неплацежаздольнасці сельскагаспадарчых арганізацый і ўзровень іх падтрымкі дзяржавай.

У ходзе пасяджэння таксама плануецца абмеркаваць шляхі прыцягнення інвестыцый, працу дэпутацкіх і маніторынгавых груп. У прыватнасці, будуць разгледжаны пытанні ўзаемадзеяння органаў мясцовага кіравання і самакіравання горада Віцебска і Віцебскага раёна з холдынгам «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка».

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

УВАГА ТАННА КАШТУЕ, АЛЕ ДОРАГА ЦЭНІЦЦА

Старшыня Мінскага аблвыканкама не выключае правядзення сустрэч для ветэранаў журналістыкі

Па большасці паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінская вобласць сёлета апераджае іншыя рэгіёны. У прыватнасці, у прамысловасці і сельскай гаспадарцы ідзе на ўзроўні 100%. Аднак валавы рэгіянальны прадукт знізіўся да 99%. Гэта выклікана некалькімі прычынамі, у першую чаргу змяншэннем аптовага тавараабароту. Гэтыя і іншыя лічбы і факты агучыў падчас сустрэчы з журналістамі старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА.

І ўсё ж, які быў гэты год для Міншчыны? Ці няма адчування, што ён самы складаны і цяжкі для кіраўніка цэнтральнага рэгіёна за ўвесь той час, што ён узначальвае вобласць? Менавіта такое пытанне цікавіла журналістаў.

— Паняцце «цяжкі год» — адноснае, — лічыць старшыня аблвыканкама. — На прыёме грамадзян у Нясвіжы мне паскардзілася жанчына, маўляў, цяжка, сям'я здымае кватэру. У гэты час мне паказалі альбом пра гісторыю раёна. На пасляваенных фотаздымках тры жанчыны і стары цягнуць на сабе плуг, людзі жывуць у зямлянках. Вось тады сапраўды было цяжка. Так, сёння ў эканоміцы сітуацыя не з найлепшых, невысокія заробкі. Але мы стараемся падтрымліваць людзей. У вобласці практычна няма запазычанасці па зарплаце за папярэднія месяцы. І самае галоўнае для нас — захаваць працоўныя калектывы.

За апошнія тры гады на Міншчыне рэалізавана больш як 170 інвестыцыйных праектаў, створана амаль 8 тысяч новых рабочых месцаў. У наступным годзе плануецца таксама павялічваць колькасць працоўных месцаў за кошт уводу ў дзеянне новых вытворчасцей. «Лёс кожнага прадпрыемства — наш штодзённы клопат. Галоўнае — не страціць кадравы патэнцыял і не спыніць заводы. Некаторыя з іх трэба паступова дыверсіфіцыраваць, пераводзіць на выпуск новых відаў прадукцыі па сучасных тэхналогіях. Гэта няхуткі, але вельмі спакойны працэс, і ён ідзе ў нашай краіне», — падкрэсліў Сямён Шапіра.

За гэты год на Міншчыне з'явілася шмат сацыяльна значных аб'ектаў: дзіцячыя садкі, дамы сямейнага тыпу, фізкультурныя аздараўленчыя комплексы, басейны, стадыёны. Дзяржава, як бы цяжка ні было, знаходзіць сродкі на іх.

— Як бы ні крытыкавалі нас некаторыя грамадзяне за новыя спартыўныя аб'екты, яны ў першую чаргу ўзводзяцца на карысць людзей, падрастаючага пакалення, заняткі ў іх умацоўваюць здароўе нацыі. А калі нацыя здаровая, то яна здольная ствараць умовы для свайго развіцця, дабрабыту, — лічыць кіраўнік сталічнай вобласці.

У наступным годзе плануецца будаўніцтва двух дзіцячых садкоў — у Мінскім раёне і ў Бараўлянах. Тут, дарэчы, працягваецца добраўпарадкаванне, уладкаванне вуліц, дарог, развязак, інфраструктуры. На чарзе іншыя пасёлкі — Міханавічы, Самахвалавічы, Гатава, Калодзішчы. Плануецца кожны год даводзіць да ладу адзін населены пункт, каб з цягам часу яны сталі зручнымі і камфортнымі для жыцця людзей.

Як адзначыў Сямён Шапіра, у вобласці прадоўжыцца практыка рамонту гаспадарчым спосабам устаноў аховы здароўя, культуры, адукацыі. Такі падыход сябе апраўдаў, хаця спачатку не ўсе кіраўнікі былі з ім згодны.

Ну і, вядома, не абышлося без тэмы падтрымкі ветэранаў працы. Як паказала нядаўняе ўшанаванне заслужаных людзей аграрнага сектара вобласці ў Маладзечне, такія мерапрыемствы сябе апраўдваюць. Ветэраны атрымліваюць добрую магчымасць сустрэцца з былымі калегамі, з першых вуснаў даведацца, як ідуць справы ў вобласці, падзяліцца вопытам.

— Мы дамовіліся збіраць напярэдадні ці пасля прафесійных свят былых заслужаных працаўнікоў і іншых сфер: медыкаў, педагогаў, урачоў. Падарункі, кветкі, сувеніры падтрымліваюць кожнага з іх не столькі фізічна, колькі маральна. Увага танна каштуе, але дорага цэніцца. Такая практыка сустрэч будзе працягвацца, — канстатаваў Сямён Шапіра.

Не выключыў Сямён Барысавіч магчымасць правядзення падобнага мерапрыемства і для ветэранаў сродкаў масавай інфармацыі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

ПРЫЯРЫТЭТЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА правяла ў Гродне сустрэчу з калектывам СТАА «Контэ СПА»

Як паведамляе карэспандэнт БЕЛТА, на сустрэчы з калектывам прадпрыемства Наталля Качанава адказала на пытанні супрацоўнікаў, большасць з якіх — жанчыны. Іх хвалявала падтрымка шматдзетных сем'яў, медыцынскае абслугоўванне, школьнае выхаванне, жыллёвыя пытанні. Паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра, у Беларусі не спыняе сваё дзеянне ні адна сацыяльная праграма.

У наступным годзе і ў наступнай пяцігодцы Беларусь прадоўжыць развівацца як сацыяльная дзяржава, прыярытэтам якой застаецца клопат аб людзях, падкрэсліла Наталля Качанава. Усе дзяржпраграмы сацыяльнай накіраванасці, якія завяршаюцца ў бягучым годзе, застаюцца і будуць дзейнічаць далей, нягледзячы на эканамічна няпросты час. Канцэпцыі дзяржпраграм на 2016—2020 гады прапрацаваны ў крыху зменены выглядзе, аднак аб кардынальных зменах размова не ідзе, растлумачыла віцэ-прэм'ер.

Наталля Качанава падкрэсліла, што папярэднія праграмы паказалі сваю эфектыўнасць. Напрыклад, мерапрыемствы па дэмаграфічнай бяспецы прывялі да павелічэння колькасці насельніцтва Беларусі больш як на 13 тыс. чалавек (на 1 кастрычніка), на гэту дату ў Беларусі пражывалі 9 млн 494,2 тыс. чалавек. Важна, каб сціскаліся існуючыя дэмаграфічныя нажніцы, падкрэсліла віцэ-прэм'ер, для чаго і ў далейшым прадоўжаць аказваць падтрымку сем'ям, будуць стымуляваць нараджальнасць.

ПАДАРУНКІ ДЛЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ

Вясёлы карагод вакол ёлкі, казачныя героі, шмат падарункаў — учора ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» Шклоўскую спецыяльную агульнаадукацыйную школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі зроку наведалі прадстаўнічыя госці на чале са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Уладзімірам ДАМАНЕЎСКІМ. Сёння тут навучаецца 89 дзяцей з Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Ад кіраўніцтва вобласці яны атрымалі салодкія падарункі, а школа-інтэрнат — брайлеўскі дысплэй для невідушчых, прыладу для чытання, інтэрактыўную дошку і іншыя неабходныя для навучання рэчы.

— У Беларусі шмат чаго робіцца для рознабаковага развіцця дзіцяці, умацавання інстытута сям'і, — адзначыў губернатар. — Гэта з'яўляецца адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Жадаю, каб, пасталеўшы, вы змаглі самарэалізавацца і заўсёды творча падыходзіць да сваіх абавязкаў, якую б прафесію для сабе ні абралі. Вы павінны рабіць дабро, якое сёння пануе ў гэтай зале, і дарыць яго навакольным людзям.

Не з пустымі рукамі прыйшлі на свята і астатнія госці. Карысныя падарункі, сярод якіх аргтэхніка, тэлевізар і сертыфікат на 50 мільёнаў, установа атрымала ад кіраўніцтва райвыканкама, галоўнага ўпраўлення Нацбанка Беларусі па Магілёўскай вобласці і прыватнага прадпрыемства «ЭкаТЭК». Выхаванцы школы-інтэрната, у сваю чаргу, падарылі губернатару зробленыя сваімі рукамі сувеніры і паказалі казку-мюзікл «Снежная каралева».

Напярэдадні Новага года віншаванні і салодкія падарункі ў рамках акцыі «Нашы дзеці» атрымаюць больш за 100 тысяч юных жыхароў Магілёўскай вобласці.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Віртуальная супольнасць

ТЫ Ў СЕЦІВЕ? ГАВАРЫ І СЛУХАЙ!

Пляцоўкай для абмеркавання галоўных трэндаў інтэрнэт-прасторы ў Беларусі стала мерапрыемства пад назвай «I_акаDEмія[A]: інтэрнэт-тэхналогіі», якое праводзілі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце. На форум з'ехаліся блогеры, вэб-журналісты, адміністратары сайтаў БРСМ з усіх куткоў краіны, якія праявілі сябе падчас Года моладзі.

Рэктар Акадэміі кіравання Марат ЖЫЛІНСКІ знаёміцца з дадаткам, распрацаваным для студэнтаў, абітурыентаў і выкладчыкаў ВНУ.

— Сёння мы ўпершыню сабралі нашых хлопцаў і дзяўчат, якія займаюцца ІТ, — распавяла **старшыня Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ, каардынатар работы арганізацыі ў інтэрнэце Алеся ВІННІК.** — Гэта тыя, хто рэалізуе самыя розныя інтэрнэт-праекты, стварае цікавыя праграмы ў сферы інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій, тыя, хто зарэкамендаваў сябе як вядомы блогер, або тыя, хто ўмее прасоўваць суполкі ў сацыяльных сетках. І — самае галоўнае — усе яны гатовы дзяліцца досведам з паплечнікамі.

— Зараз інтэрнэт з'яўляецца адным з асноўных сродкаў камунікацыі, і асабліва актыўна ім карыстаецца моладзь, — падзяліўся меркаваннем **дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксей ДЗЕРБІН,** які прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця форуму. — Менавіта таму сённяшняе мерапрыемства актуальнае, як ніколі: моладзі важна быць пачутай, важна мець магчымасць кантактаваць. Яе даюць шматлікія сацыяльныя сеткі і іншыя рэсурсы — там можна выказаць сваё меркаванне, прапанаваць канкрэтныя рашэнні. Зусім нядаўна мы завяршылі праект «Разумныя сеткі», які якраз быў скіраваны на працу з маладымі аналітыкамі, прыцягненне іх да выпрацоўкі дзяржаўных рашэнняў, развіцця аналітычнай супольнасці. Таму мы актыўна рухаемся ў гэтым кірунку.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Сацпакет

ПЕНСІЙНУЮ СІСТЭМУ ЧАКАЮЦЬ РЭФОРМЫ

Сярод іх — абавязковае страхаванне для замежных работнікаў і павышэнне стажу

Мінпрацы запэўнівае: усе магчымыя змены будуць праходзіць плаўна. «Мы хочам, каб яны не сталі стрэсам для насельніцтва і атрымалі падтрымку ў грамадстве, — гаворыць намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ. — Будзем арыентавацца на выкананне сацыяльных абавязацельстваў».

ІЛЬГОТНЫХ ВЫПЛАТ СТАНОВІЦЦА МЕНШ

Па падліках ведамства, тэндэнцыя росту новых пенсіянераў будзе змякчацца. Але гэта не значыць, што доля пажылых у агульнай колькасці насельніцтва знізіцца.

— Пік дэмаграфічнай хвалі ў нас прыпаў на 1958 год. Сёлета на пенсію выходзілі жанчыны 1960 года нараджэння і мужчыны 1955 года нараджэння. Пік мы ўжо прайшлі. Разам з тым вялікая колькасць пенсіянераў захаваецца: гэта звязана з ростам працягласці жыцця. Нагрузка на пенсійную сістэму расце, бо становіцца меншым працэнт працаздольнага насельніцтва, — тлумачыць Валерый Кавалькоў.

У краіне даўно прымаюцца захады, накіраваныя на зніжэнне нагрузкі на пенсійную сістэму. Адным з такіх крокаў было ўвядзенне з 2009 года прафесійнага пенсійнага страхавання работнікаў, занятых у неспрыяльных умовах працы. Заканадаўствам прадугледжваецца, што наймальнік пералічвае дадатковыя мэтавыя абавязковыя ўзносы, а потым з гэтых зберажэнняў чалавеку выплачваецца датэрміновая пенсія. Такім чынам для льготнай пенсіі фарміруецца асобная крыніца фінансавання. Гэта паступова вызваліць сістэму ад адпаведных выдаткаў. Тады ж удалося замацаваць крытэрыі шкоднасці для ўсіх катэгорый работнікаў. Вызначаць права на датэрміновую пенсію стаў характар працы, а не наяўнасць прафесіі ў пэўных спісах.

— Колькасць датэрміновых выплат у агульнай сістэме будзе зніжацца, — кажа намеснік міністра. — Калі да прыняцця новага заканадаўства льготнай была кожная чацвёртая пенсія (27 працэнтаў новых прызначэнняў), то цяпер толькі кожная восьмая. Сістэма прафесійнага страхавання ўжо апраўдвае чаканні па абмежаванні пенсійных ільгот.

Замест выхаду на датэрміновую пенсію дазваляецца дапрацаваць да агульнаўстаноўленага ўзросту і атрымліваць накапляльныя ўзносы ў дадатак да асноўных выплат. Таксама маладыя работнікі могуць выбраць: фарміраваць права на датэрміновую пенсію ці замест гэтага ўзяць даплату да заробку. «Мы лічым, што абарона работніка падчас працы больш актуальная», — каментуюць такое рашэнне ў міністэрстве.

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ НЕ ПРЫЗНАЮЦЦА Ў ПРЫБЫТКАХ

Як паказвае абследаванне хатніх гаспадарак, пагрозы трапіць за мяжу беднасці ў пенсіянераў няма. Змяншэнне прыбыткаў ніжэй за бюджэт пражыткавага мінімуму хутчэй верагодна для асобных малазабяспечаных сем'яў з дзецьмі, чым для пажылых людзей.

Цяпер выплаты па ўзросце спрабуюць рабіць больш дыферэнцаванымі, каб тыя, хто меў большы заробак, мог і на пенсіі атрымліваць больш. Так, на сёння максімальная працоўная пенсія вышэйшая за мінімальную ў 2,8 раза. Са студзеня 2016 года, у сувязі з уступленнем у сілу нормаў аб дадатковым павышэнні пенсіі за доўгі стаж, чакаецца, што гэтыя суадносіны павялічацца да 3,1 раза. У міністэрстве спадзяюцца, што такая дыферэнцыяцыя будзе стымуляваць грамадзян указваць свой рэальны прыбытак.

Без згоды народа змяняць узроставую планку не будуць. І сітуацыі, калі чалавек з аб'ектыўных прычын працаваць у гэтыя гады не можа, абяцаюць улічыць.

— Сёння прадпрымальнікі і іншыя самазанятыя самастойна вызначаюць памер даходу, з якога яны плацяць узносы на сацыяльнае страхаванне, — кажа Валерый Кавалькоў. — Ёсць адзіная ўмова: гэты прыбытак павінен быць не ніжэйшым за мінімальны заробак. У працэнтах 90 выпадкаў нашы індывідуальныя прадпрымальнікі ўказваюць мінімальны заробак як свой даход. Прычым гэтая тэндэнцыя назіралася не толькі ў крызісны год. Раней ніжняга парога не было, і мы былі вымушаны яго ўнесці, бо многія ўвогуле паказвалі, што цэлы год працуюць у страту.

У найбліжэйшы перыяд плануецца распаўсюдзіць абавязковае сацыяльнае страхаванне на замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія прыязджаюць на заробкі ў Беларусь (пакуль яны ўдзельнічаюць у сістэме на добраахвотных асновах). Гэта дазволіць павялічыць паступленні ў фонд. І ліквідуе перавагу замежных работнікаў: пакуль яны больш выгадныя для наймальніка, бо за іх не трэба плаціць узносы. Працоўныя мігранты, як правіла, не ведаюць аб тым, што яны мусяць пісаць заяву, каб удзельнічаць у сацыяльным страхаванні, таму для арганізацыі такі персанал каштуе на 34 працэнты танней.

ПАВЫШАЦЬ УЗРОСТ ТРЭБА З ЖАНЧЫН

Міністэрства ўжо не раз заяўляла аб магчымым павелічэнні неабходнага працоўнага стажу. Яго павышэнне, напрыклад, да 20 гадоў практычна зраўняла б перыяд фарміравання права на пенсію і час яе атрымання.

— Але мы не будзем ісці такімі шокавымі крокамі, па пяць гадоў, — абяцае Валерый Кавалькоў. — У Адміністрацыі Прэзідэнта ёсць ужо праект нашага ўказа, дзе прапаноўваецца павялічваць страхавы стаж штогадова на паўгода.

Што тычыцца пенсійнага ўзросту, то афіцыйнага рашэння аб павышэнні пакуль няма. Аднак Валерый Кавалькоў лічыць гэты захад неабходным: «Як спецыяліст магу сказаць, што без павелічэння пенсійнага ўзросту мы літаральна праз некалькі гадоў будзем вымушаны зніжаць суадносіны паміж сярэднім памерам пенсіі і сярэдняй заработнай платай. 40 працэнтаў захоўваць не атрымаецца».

Павышаць пенсійны ўзрост, на думку ведамства, трэба пачынаць з жанчын. І гэтаму ёсць тлумачэнне. Працягласць жыцця пасля выхаду на адпачынак па ўзросце для мужчын складае 16 гадоў, а для жанчын — 26. Дэмографы звяртаюць увагу таксама на тое, што змянілася роля жанчыны ў грамадстве. Калі размова ішла аб вызначэнні ўзросту выхаду на пенсію, то беларускі нараджалі па пяцёра дзяцей і з улікам гэтага быў выбраны такі тэрмін.

У любым выпадку без згоды народа змяняць узроставую планку не будуць. І сітуацыі, калі чалавек з аб'ектыўных прычын працаваць у гэтыя гады не можа, абяцаюць улічыць. Даследаванне грамадскай думкі па пенсійных пытаннях гатовы правесці Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі.

— Часам прыходзіцца прымаць непапулярныя рашэнні, каб не стала горш, — заўважыў Валерый Кавалькоў. — Але мы старанна ўсё прадумваем, перш чым зацвердзіць.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Факт

У ПАНЯДЗЕЛАК ПАДМАРОЗІЦЬ, А Ў ПЯТНІЦУ — ДОЖДЖ

У наступныя двое сутак надвор'е ў Беларусі будуць вызначаць цёплыя паветраныя масы, што рухаюцца да нас з боку Атлантыкі. Сёння без ападкаў, але ветрана, а максімальная тэмпература паветра складзе плюс 4-9 градусаў, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.

Цёпла будзе і ў пятніцу. Уначы на 25 снежня пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі туман, галалёд і галалёдзіца на дарогах. Удзень амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — плюс 2-8 градусаў. Даволі цёпла будзе і ў суботу. Удзень у большасці раёнаў непрацяглыя дажджы, аднак па поўначы краіны магчымы мокры снег. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — 2-7 цяпла, у Брэсцкай вобласці — да плюс 9 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у нядзелю крыху пахаладае і ўначы месцамі чакаецца ўжо мокры снег. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У пачатку наступнага тыдня надвор'е ўвогуле стане амаль зімнім. Уначы будзе падмарожваць да мінус 7 градусаў, а ўдзень чакаецца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Тады ападкі будуць ужо выключна ў выглядзе мокрага снегу і снегу.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРАЕЗД ПРЫБАВІЎ У КОШЦЕ

Кошт праезду ў наземным грамадскім транспарце Мінска павялічыўся да 5 тысяч, у метро — да 5,5 тысячы рублёў. Такім чынам, паездка ў аўтобусах, трамваях, тралейбусах стала даражэйшай на 500 рублёў, у метро — на тысячу.

Цана праязнога на месяц на адзін від транспарту (аўтобус, трамвай, тралейбус) зараз складае 225 тысяч, метрапалітэн — 247,5 тысячы. Кошт месячнага праязнога на два віды транспарту складзе ад 300,3 тысячы да 360,4 тысячы; на тры віды — ад 358,1 тысячы да 405,8 тысячы; на чатыры віды — 415,1 тысячы рублёў.

Нагадаем, што папярэдняе павышэнне коштаў на праезд у сталіцы адбылося год таму — таксама ў снежні. Тады праезд падаражэў з 4 да 4,5 тысячы рублёў за адну паездку.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Калькулятар

Што зменіцца разам з базавай велічынёй?

З пачатку наступнага года базавая велічыня павысіцца на 30 тысяч да 210 тысяч рублёў. А значыць, выплаты, якія залежаць ад яе, таксама павялічацца.

ПА ЧАТЫРЫ МІЛЬЁНЫ З УТРЫМАНЦА

Зраўняць дапамогу па беспрацоўі з бюджэтам пражытачнага мінімуму плануюць не раней, чым праз два гады. Але, у сувязі з ростам базавай велічыні, гэтыя выплаты крыху падрастуць. Сума, на якую зможа разлічваць незаняты грамадзянін, — да 420 тысяч рублёў у месяц. Максімальная стыпендыя беспрацоўным, накіраваным на бясплатнае перанавучанне, складзе 630 тысяч. Тым жа, хто не ўдзельнічаў у фінансаванні дзяржаўных выдаткаў на працягу больш чым 183 дзён у годзе, давядзецца заплаціць 4,2 мільёна рублёў (20 базавых велічынь). Калі прымаўся адпаведны дэкрэт, падатак на сацыяльнае ўтрыманства абяцаў быць на 600 тысяч меншым.

Вырастуць і штрафы для нядобрасумленных наймальнікаў.

— Цяпер за неапавяшчэнне ці несвоечасовае папярэджанне аб вакансіях працадавец мусіць заплаціць ад 900 тысяч да 3,6 мільёна. Са студзеня максімальны памер штрафу вырасце да 4,2 мільёна, — каментуе **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Мінпрацы Алег ТОКУН.** — За адмову ў прыёме на працу па броні, напрыклад інвалідаў ці сірот, з наймальніка могуць спагнаць да 10,5 мільёна (пакуль што — да 9 мільёнаў).

Працадаўцу, які затрымлівае заробак, чакае штраф да чатырох мільёнаў. За парушэнне патрабаванняў па ахове працы — да 10,5 мільёна.

РУБЛЁМ — ПА «ШЭРЫХ» КВАТЭРАЗДАТЧЫКАХ

Вядома, што падатковая інспекцыя ўвогуле не вітае тых грамадзян, якія здаюць свае кватэры ў арэнду без афіцыйнага афармлення. Аднак больш сур'ёзна плануюць караць менавіта тых, хто збіраецца атрымліваць дадатковы даход ад арэнды жылля, якое было пабудавана з дзяржаўнай падтрымкай. Тыя, хто здае кватэры, якія былі пабудаваны па льготных крэдытах, могуць быць аштрафаваны на 4-30 базавых велічынь, а з 1 студзеня такі штраф складзе ўжо ад 840 тысяч да 6,3 млн рублёў. За тое ж дзеянне, учыненае паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, штраф можа павялічыцца да 10,5 млн рублёў.

Увогуле, падатковая служба прапануе налета ў разы павялічваць падатковыя стаўкі за здачу жылля за той час, калі жылое памяшканне здавалася ўпотай.

РАЗВОДЗІЦЦА Ў ЧАТЫРЫ РАЗЫ ДАРАЖЭЙ

Налета даволі істотныя штрафы (20-200 БВ) могуць атрымаць усе індывідуальныя прадпрымальнікі, якія будуць прадаваць тавары лёгкай прамысловасці без сертыфікатаў. А гэта ўжо сумы ад 4,2 да 42 млн рублёў. У студзені вырастуць і памеры дзяржпошлін. Напрыклад, за замену пашпарта трэба будзе заплаціць 105 тысяч рублёў.

ЖАНІЦЬБА ПАДАРАЖЭЕ

Больш давядзецца плаціць тым, хто здымае дзяржаўнае арэнднае жыллё. Напрыклад, аднапакаёвая кватэра плошчай у 40 квадратных метраў у цэнтры Мінска пацягне на 2,5 мільёна ў месяц, «двушка» (60 квадратаў) абыдзецца амаль у 3,8 мільёна (цяпер іх арэнда каштуе на 200 тысяч і на 600 тысяч менш адпаведна). Самую танную «аднушку» з дзяржаўнага фонду ў сталіцы будуць здаваць прыкладна за 800 тысяч.

Штраф за самавольную перапланіроўку кватэры вырасце да 6,3 мільёна (максімальны памер). Калі пераўладкаванне закране апорную канструкцыю ці вентыляцыйную шахту, могуць спагнаць і 10,5 мільёна.

На 30 тысяч павялічыцца штогадовы збор за аграэкатурызм і рамесніцтва (абодва прыроўнены да адной базавай велічыні).

Збіраецеся ажаніцца пасля Новага года? Рыхтуйце 210 тысяч рублёў. Хочаце скласці шлюбны дагавор — прыплюсуйце яшчэ амаль 1,7 мільёна (калі паспець у гэтым годзе, абыдзецца на 200 тысяч танней).

ЗА НЕЦВЯРОЗАСЦЬ — 21 МІЛЬЁН

За безбілетны праезд у грамадскім гарадскім транспарце ў 2016-м папросяць на 15 тысяч больш — 105 тысяч. Калі ж вас без квітка зловяць на прыгарадным маршруце, давядзецца заплаціць 147 тысяч.

Павялічаныя штрафы чакаюць парушальнікаў ПДР. За перавышэнне хуткасці на 20-30 кіламетраў у гадзіну будуць спаганяць 420 тысяч, на 30-40 кіламетраў у гадзіну — 840 тысяч. Тыя, хто ездзіць у нецвярозым стане, са студзеня мусяць аддаць ад 10,5 да 21 мільёна. Забыліся пераабуць аўто ў зімовую гуму — заплаціце да мільёна рублёў. Столькі ж будзе каштаваць непрышпілены рамень бяспекі.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*
Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

БЕЛАРУСЬ, НЕ БОЙСЯ ПРЫНЯЦЬ ХРЫСТА!

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Божае Нараджэнне стала сапраўднай рэвалюцыяй у гісторыі чалавецтва, бо Сын Божы стаўся чалавекам для нас і нашага збаўлення, прынёс у гэты грэшны свет новы закон любові да блізкага і адарыў яго збаўчай ласкай. Падобная духоўная рэвалюцыя павінна адбыцца і ў кожным з нас, каб мы моцна трымаліся сваёй веры і не дазволілі спіхнуць яе на ўзбочыну жыцця, але з высока паднятай галавой ішлі праз яго, ведаючы, што нашай мэтай ёсць шчаслівая вечнасць.

Папа Францішак кажа, што без веры ў Хрыста мы хаця і можам рабіць добрыя справы, аднак не можам быць сапраўдным Касцёлам як Абраннікам Хрыста. Адсюль вынікае вялікая дылема: кім быць — паклоннікамі Хрыста ці Яго сапраўднымі вызнаўцамі? Вельмі часта мы становімся першымі, а не другімі. Кажам, што з'яўляемся веруючымі, чынім шмат добрага, але ў той жа час не вызнаём Хрыста як свайго Пана, не заўсёды прымаем удзел у нядзельнай ці святочнай святой Імшы і не жывём згодна з маральным законам.

Кім ты хочаш быць, сучасны чалавек? Вызнаўцам, паслядоўнікам і сведкам Хрыста ці толькі Яго паклоннікам? Хочаш даверыцца Езусу ці свету? Адказаць на гэтыя і падобныя пытанні нам можа дапамагчы апостал Пётр. Мы добра ведаем евангельскі аповед аб тым, як па загадзе Езуса Пётр пайшоў па бурлівым возеры, пакуль не спалохаўся і не пачаў тануць.

Даверыцца Хрысту — значыць пайсці за Яго голасам, як Пётр, выйсці з чаўна XXI стагоддзя, каб ісці па хвалях бурлівага возера нашага часу, які нам навязвае свой стыль жыцця. Езус нас не пакідае адных у гэтым чаўне, але ідзе ў яго напрамку і кажа: «Будзьце адважнымі, гэта Я; не бойцеся!» (Мц 14, 27). Гэтым Ён заклікае не трымацца навязанага нам светам секулярнага стылю жыцця, а знайсці свой хрысціянскі і яго сведчыць.

Хто для нас ёсць Езус?

Заахвочаны заклікам Езуса, Пётр пайшоў па вадзе. Аднак у пэўны момант ён сканцэнтраваўся не на Езусе, але на бурлівых хвалях возера. У выніку чаго засумняваўся і пачаў тануць. Падобна адбываецца і ў нашым жыцці. Калі перастаём глядзець на Езуса, а засяроджваемся толькі на жыццёвых праблемах, то губляем пад нагамі грунт і пачынаем тануць. Тады нам не застаецца нічога іншага, як крычаць: «Пане, ратуй!»

Калі людзі ўспрымалі Езуса як Яна Хрысціцеля, Ілью, Ерамію ці іншага прарока, то для Пятра Ён быў Месіяй, Сынам Бога жывога. Гэтае сцверджанне Князя апосталаў з'яўляецца ключом да веры ў асобу Езуса з Назарэта.

Сёння Езус пытаецца ў нас, кім Ён, народжаны ў Бэтлееме, з'яўляецца для людзей XXI стагоддзя. Мы добра ведаем, як ставіцца да Хрыста сучасны лібералны свет. Ён вельмі часта не жадае мець з Ім нічога супольнага і не хоча чуць Яго голасу, які заклікае да абуджэння сумлення, вяртання і жыцця паводле Яго вучэння.

У такой сітуацыі мы, хрысціяне, павінны даць рашучы адказ, хто Ён ёсць для нас. Толькі гістарычная фігура ці Той, які жыве ў сваім Касцёле і вучэнне якога актуальнае і ў наш час? Адказ на гэтае пытанне вядзе да веры ў асобу Езуса Хрыста як уцелаўлёнага Сына Божага. Таму мы павінны адвесці Яму месца ў нашых сэрцах і пачуць Яго голас.

Нельга гаварыць аб асобе Езуса без Таямніцы ўцелаўлення, якая з'яўляецца адной з найбольшых таямніц хрысціянства. Мэта прыйсця Божага Сына ў гэты свет была прадыктавана толькі адным аргументам — любоўю Бога да чалавека. Таямніца ўцелаўлення з'яўляецца вялікім дарам для чалавецтва і адначасова заданнем, якое перадусім праяўляецца ў даверы да Езуса і хрысціянскім сведчанні.

Успомнім евангельскі аповед пра цудоўны ўлоў рыбы. Апосталы лавілі ўсю ноч і нічога не злавілі. Тады Езус сказаў ім адплысці на глыбіню, і стаўся цуд. Яны злавілі такую вялікую колькасць рыбы, што нават рваліся сеткі.

«Адплыві на глыбіню», — з гэтымі словамі Езус сёння звяртаецца да нас. Чалавек, ты створаны па вобразе і падабенстве Божым, адкуплены Сынам Божым і маеш годнасць Божага дзіцяці. Таму не плёскайся на мелі, а адплыві на глыбіню духоўнага жыцця, каб яно прынесла багаты плён. Нездарма прыказка кажа, што вялікаму караблю — вялікае плаванне. А чалавек, як Божае стварэнне, — гэта вялікі карабель.

Можа, сеткі твайго жыцця пустыя, можа, дагэтуль нічога не ўдалося злавіць, можа, твае жыццёвыя планы і мары не рэалізаваліся. Але ты не адзін, і Езус сёння цябе заклікае: «Не бойся, не паддавайся, адплыві яшчэ раз на глыбіню твайго жыцця, тваіх мар, імкненняў, болю, цярпенняў, адзіноты і яшчэ раз закінь сеткі, бо Я з табой». А адплыць на глыбіню азначае яшчэ раз рызыкнуць, даверыць сябе Езусу, Эмануэлю — як Богу з намі.

У той жа час страх і баязлівасць перад светам не дазваляюць нам гэтага ўчыніць. Мы жывём у чоўне дваццацьпершастагоддзевага стылю жыцця і яго моды і баімся з яго выйсці, бо што скажа свет, што скажуць блізкія і сябры. Могуць назваць старамоднымі. Сёння хрысціяне могуць згадзіцца на разводы, аборты, эўтаназію, апладненне «in vitro», гомасексуальныя саюзы і іншыя духоўныя анамаліі. Чаму? Бо свет такі, бо мы яго баімся, бо лягчэй плысці па цячэнні, чым супраць, бо ў наша духоўнае жыццё ўваходзіць феномен паліткарэктнасці, калі мы не маем, а можа, не хочам мець свайго меркавання па тым ці іншым маральным пытанні.

Страх перад светам нас паралізуе і не дазваляе даверыцца Хрысту. У кожным з нас у большай ці меншай ступені ён прысутнічае, і толькі давер Езусу дапамагае яго перамагчы. Для гэтага неабходна адмовіцца ад сваёй ганарлівасці, перамагчы самога сябе і сказаць: «Так, Пане Езус, я, як Твой вучань, не згаджаюся з тым, што прапануе секулярны стыль жыцця». Калі так учыню, то перамагу самога сябе і страх, які мяне апанаваў, каб быць сапраўдным вызнаўцам Хрыста.

Тут да месца ўзгадаць словы святога Яна Паўла II, які ў далёкім 1978 годзе казаў: «Не бойцеся, адчыніце насцеж дзверы Хрысту. Яго збаўчай уладзе адчыніце межы дзяржаў, эканамічных і палітычных сістэм, шырокія сферы культуры, цывілізацыі і развіцця! Не бойцеся! Хрыстус ведае, што ў сабе носіць чалавек. Ён адзін гэта ведае!»

Дзякуй Богу, дзверы Хрысту ў нашай краіне адчыніліся, і мы атрымалі свабоду веравызнання. Аднак злы дух не спіць і ўвесь час дзейнічае. У выніку чаго ў сучасным, асабліва заходнім, свеце з'явілася шмат такіх небяспечных выклікаў, аб якіх яшчэ зусім нядаўна мы нават не маглі і падумаць. І мы бачым, як палітычныя і эканамічныя сістэмы, а таксама культуры адмаўляюцца ад Бога. Ізноў паўтараецца гісторыя з Бэтлеема, бо ў сучасных грамадствах і чалавечых сэрцах не знаходзіцца месца для нараджэння Валадара сусвету сваёй ласкай. Хрыстус прыходзіць да сваіх, а яны Яго не прымаюць, нягледзячы на Яго абяцанне, што тым, хто Яго прыме і паверыць у Яго, Ён дасць моц быць дзецьмі Божымі.

Сучасны свет вельмі моцна занепакоены фінансавым крызісам і ліхаманкава шукае шляхоў выйсця з яго. Здаецца, што найважнейшай справай з'яўляюцца банкі, фінансавыя рынкі і палітыкі, якія дыскутуюць аб тым, як выратаваць банкрутаў.

У той жа час неабходна падкрэсліць, што сучасны свет змагаецца не толькі з фінансавым, але і з культурным і духоўным крызісам. Матэрыяльныя каштоўнасці і прыемнасці сталі новымі багамі, якім усе пакланяюцца і падпарадкоўваюць сваё жыццё. З праслаўленнем фальшывых бажкоў чалавецтва адварочваецца ад адзінага і сапраўднага Бога.

Божы закон лічыцца састарэлым, неактуальным і ўспрымаецца як рэлікт мінулых часоў. Усё больш маладых людзей жыве без шлюбу, і такі стыль жыцця лічыцца знакам свабоды і сучаснасці. Кожнае пятае дзіця ў нашай краіне выхоўваецца ў няпоўнай сям'і. А колькі разводаў і іншых сямейных трагедый, звязаных з насіллем, алкагалізмам, наркаманіяй!

Сучасныя медыя ў шматлікіх серыялах, рэкламах і забаўляльных праграмах распаўсюджваюць стыль жыцця, у якім зло, грэх і незахаванне Божага закону ўспрымаюцца як нешта захапляльнае і пазітыўнае. Усё гэта вядзе да таго, што заганы называюцца норавамі.

Наш час — гэта таксама час вельмі небяспечных залежнасцяў ад азартных і камп'ютарных гульняў, шопінгу, інтэрнэту, алкагалізму, наркаманіі, неўпарадкаванага сексуальнага жыцця і г.д. Бурнае развіццё тэхналогій і імкненне да як мага большай прадукцыйнасці падрывае праўдзівы сэнс і значэнне чалавечай працы. Нярэдка культура, падмяняючы духоўнае свецкім, спрыяе ўкараненню амаральнасці.

На гэтым фоне не хапае праграм, якія б фарміравалі сумленне чалавека і распаўсюджвалі духоўныя каштоўнасці, такія як малітва, дабрачыннасць, міласэрнасць, працавітасць, адказнасць, ахвярнасць і да т.п. Замест іх пануюць дэмаралізуючыя: гвалт, эротыка, імкненне да ўзбагачэння любой цаной, забаўляльны стыль жыцця і г.д. Гэта не што іншае, як прапаганда педагогікі зла і фармацыя да ліберальнай мадэлі жыцця. У выніку людзі губляюць здольнасць адрозніваць дабро ад зла.

Усё гэта, разам з іншымі шматлікімі праблемамі сацыяльнага, грамадскага і палітычнага характару, негатыўна ўплывае на рытм біцця сэрца сучаснага свету і нашага народа. І мы не заўсёды ўсведамляем, што такія праблемы ўзнікаюць з прычыны непрыняцця Божага закону. Таму найбольш небяспечнай пагрозай для хрысціянства з'яўляецца рэлігійная абыякавасць хрысціян. У выніку гэтага мы самі сабе ствараем сітуацыю глыбокага маральнага крызісу і ў пэўным сэнсе нагадваем «Тытанік», на якім, нягледзячы на набліжэнне катастрофы, аркестр іграў да апошняй хвіліны, а пасажыры пілі шампанскае.

У той жа час народжаны ў Бэтлееме Езус праз паслугу Касцёла прыходзіць да нас. Не трэба баяцца прыняць Яго, бо Ён нічога не адбірае, а дае ўсё, як вучыць Папа Бенядыкт XVI. Каб пазбегнуць негатыўнага ўплыву сучасных секулярных тэндэнцый, неабходна адчыніць Яму дзверы нашых сэрцаў і душ! Неабходна адчыніць сёння, бо заўтра можа быць позна!

Езус, увайдзі сваёй духоўнай моцай у наша грамадства і аздараві яго! Увайдзі ў сем'і, якія перажываюць крызіс, каб яны былі моцныя Богам. Увайдзі ў нашу моладзь, якая хоча быць сучаснай і, знаходзячыся пад уплывам рознага кшталту спакус, змагаецца за сваю хрысціянскую тоеснасць. Увайдзі ў палітычныя, эканамічныя і культурныя сістэмы, каб яны як мага лепш служылі дабру чалавека і спрыялі яго духоўнаму росту. Святлом свайго Евангелля асвятлі наш шлях. Умацуй нашу веру, надзею і любоў!

Дарагія браты і сёстры!

Віншую ўсіх каталікоў з радасным і збаўчым святам Нараджэння Хрыста!

Віншую хрысціян іншых веравызнанняў, якія сёння адзначаюць яго!

Віншую братоў і сясцёр праваслаўных, якія ў хуткім часе будуць святкаваць Божае Нараджэнне!

Віншую ўсіх людзей добрай волі! Сын Божы прыйшоў у гэты свет у вобразе чалавека для ўсіх, а сённяшняе свята ў Беларусі адзначаецца таксама і на дзяржаўным узроўні.

Падобна да таго, як нованароджанае немаўля з'яўляецца знакам надзеі для яго бацькоў, таксама і Немаўля Езус нясе новую надзею ўсім нам і нашай Бацькаўшчыне, бо Бог паслаў свайго Сына, народжанага з Марыі Дзевы, каб аб'явіць нам канчаткова сваю любоў, як кажа Папа Францішак, абвяшчаючы юбілейны Год Міласэрнасці.

Таму, Беларусь, не бойся прызнаць у Хрысце Сына Божага, прымі Яго і даверся Яму! Ён сваёй любоўю залечыць твае раны, прывядзе да так патрэбнага ўсім нам цуду паяднання і ўчыніць цябе новай і шчаслівай!

Гэтыя свае пажаданні ўмацоўваю благаславеннем у імя Айца, і Сына, і Духа Святога і ў знак нашай духоўнай еднасці дзялюся з вамі традыцыйнай аплаткай. Амэн.

Арцыбіскуп
Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.
Мінск, 2015 год

МСЦІСЛАЎ ПАЧЫНАЕ ПЕРАТВАРАЦЦА Ў ГОРАД-МУЗЕЙ

У наступным годзе Мсціслаў стане сталіцай абласнога фестывалю-кірмашу «Дажынкі» і збіраецца сустрэць гасцей ва ўсёй сваёй прыгажосці. Ужо існуе 3D-праект, дзе можна ўбачыць, якія яго чакаюць перамены.

Цэнтральная плошча будзе рэканструявана, на ёй з'явіцца каланада, у парку — бялюткая ратонда і невялікі фантан. Вуліцы і тратуары апрануцца ў сучаснае асфальтабетоннае пакрыццё, а ў гістарычным цэнтры будзе брукаванка. Адновяцца фасады, другое жыццё набудуць аб'екты XVIII — пачатку XX стагоддзя — Троіцкая царква і будынак былой мужчынскай гімназіі. Мсціслаў упрыгожыць Палац шлюбаў і ўрачыстасцяў, пад які плануецца рэканструяваць былы кінатэатр «Мір». І зусім не пазнаць будзе Замкавую гару. Тут плануюць пабудаваць вежу-данжон, накрыць музеефікаваны раскоп, зрабіць рысталішча для конных баёў і крапасную сцяну ў стылі XII стагоддзя.

— Усё залежыць ад кожнага жыхара нашага горада, ад яго ўдзелу,— кажа **старшыня Мсціслаўскага райсавета дэпутатаў Святаслаў КУСАЎ.** — Без гэтага ніякае фінансаванне не дапаможа. У сілах кожнага навесці парадак вакол свайго дома, прыватнага або шматкватэрнага. Нядаўна адбылося пасяджэнне рабочай камісіі па эканоміцы з удзелам старшых па доме, дзе падымалася пытанне па добраўпарадкаванні горада. Людзі не супраць прыняць долевы ўдзел у рамонце, каб зрабіць ля свайго шматпавярховіка стаянку для аўтамабіляў, прыгожую дзіцячую пляцоўку. Дагэтуль такіх прыкладаў у нас не было. А тое, што датычыцца аднаўлення гістарычных аб'ектаў, гэта наогул справа гонару. Мы павінны іх захаваць і перадаць нашчадкам. Жыхары горада падтрымалі стварэнне фонду па аднаўленні гістарычных помнікаў. Спадзяёмся, што ўбаку не застануцца і ўсе тыя, хто зацікаўлены ў захаванні славутасцяў Беларусі.

Цэнтральную плошчу ўпрыгожыць каланада.

Замкавую гару будзе не пазнаць.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

СЛУХАЙ СВАЁ СЭРЦА,

або Цудоўны фільм пра рэальнае каханне

Напярэдадні Новага года і Каляд усе мы пачынаем верыць, марыць і чакаць цудаў. Падводзім вынікі года, які літаральна праз тыдзень стане гісторыяй. Строім планы, дзе і з кім будзем сустракаць святы. А можа, і ўвогуле думаем пачаць жыццё з белага ліста ці з'ехаць у іншы горад хоць на дзень, набыўшы спантанна квіток... Пры жаданні здзейсніць падарожжа па пераднавагодняй беларускай сталіцы паглядзіце фільм «Усё, што нам трэба...» (2011) рэжысёра Івана Паўлава (вядомага беларускаму гледачу па такіх фільмах, як «Свежына з салютам», «Глыбокая плынь», «На спіне ў чорнага ката», «Навагоднія прыгоды ў ліпені»).

ГАЛОЎНЫ пасыл карціны працягласцю ў чатыры серыі ў тым, што для людзей няма нічога немагчымага. І найлепшае месца для такой гісторыі — гэта вялікі горад. У нашым выпадку ўсе падзеі адбываюцца ў беларускай сталіцы за

«Усё, што нам трэба...»

чатыры дні да надыходу Новага года. Тут жывуць бізнесвумен Дзіяна Арцем'ева, пісьменнік Вадзім Буржэ, хакеіст Дзяніс Чашчын, студэнтка Даша Качаліна, хатняя гаспадыня Святлана Астахава і многія іншыя персанажы. Яны звычайныя людзі, за якімі можна назіраць у звычайным жыцці...



«Хто тут добры, адгадайце».

Дарэчы, першае ўражанне ад герояў можа аказацца падманным. Святлана мае мужа і дваіх сыноў. Даша вучыцца ва ўніверсітэце і любіць кнігі. Дзіяна кіруе ўласнай кампаніяй. Вера працуе правадніцай. Кожнаму сваё, як той казаў. Аднак узнікае пытанне: ці дастаткова «засвоіць» у жыцці пэўную ролю, каб быць шчаслівай? Калі ёсць грошы, то цану ведаеш не ўсяму. Аднастайнасць сямейнага жыцця, дзе кожнае «заўтра» паўтараецца, «дзень сурка», аднойчы набівае аскому... І што тады? Бывае, у справу ўмешваецца лёс і дарыць сустрэчу з новым чалавекам, а потым мы самі крок за крокам мяняем сваю гісторыю... Як, напрыклад, Даша, якая ў кніжнай краме, дзе кнігі класікаў ляжаць на падлозе, а побач сучасны аўтар жаночых раманаў раздае аўтографы, просіць падпісаць і для яе экзэмпляр. Яна нават не ведае, чым абернецца для многіх гэтая просьба. Робіш крок — рыхтуйся да наступстваў...

НАМ заўсёды даецца шанц пачаць жыццё спачатку. Але, як адзначае адзін з герояў фільма, «навошта мне купляць востраў, калі я буду на ім адзін»?

Бізнес-лэдзі Дзіяна — добрая «ілюстрацыя» жанчыны, якая мае поспех і мужчыну (ён, дарэчы, любіць не яе, а яе грошы), і ўсё ж адчувае сябе няшчаснай. Вырашае ўзяць на выхаванне дзяўчынку з дзіцячага дома. Ці стане такі ўчынак магчымасцю рэалізаваць сябе ў новай ролі і як гэта паўплывае на яе ўспрыманне навакольнага свету? У фільме гучыць яшчэ адно важнае пытанне: дзе сёння знайсці дастойнага мужчыну? Разгледзець яго ў прывабным пакупніку ў краме альбо ў «бяздомным» безбілетніку на вакзале, які потым можа аказацца вядомым хакеістам? Слухайце сваё сэрца!..

Акцёрам верыш і не ўспрымаеш іх жыццё на экране як ігру. Зачароўвае і музыка ў выкананні гурта «Мегаполіс». (Сярод станоўчых водгукаў знайшла такі: «Цудоўны пераднавагодні фільм пра рэальнае каханне. Падыдзе для сямейнага прагляду. Добрая музыка, выдатная ігра акцёраў і чароўныя зімовыя пейзажы... Фільм атрымаўся па-сапраўднаму душэўным. А гэта тое, што нам трэба».)



«Часам трэба толькі азірнуцца».

КАЖУЦЬ, хто не рызыкуе, той не п'е шампанскага. Аднак не ўсе і не заўсёды застаюцца ў выйгрышы... Не заўсёды «келіх чароўнага напою» (няхай гэта новыя пачуцці, жаданне рэалізавацца ў працы) нам на карысць. Тут варта спыніцца і прыслухацца да сябе, агледзецца навокал і проста не забываць пра тое, што адносіны патрабуюць штодзённай працы, адказнасці за словы і ўчынкі. Напрыклад, руціна сямейнага жыцця не знікне, калі «асвяжыць» яе раманам з незнаёмцам (так адбываецца ў Святланы з палкоўнікам Сяргеем). Разам з тым можна выйсці замуж дзеля штампа (так робяць героі Дзіяны і Анатоля), а потым і ўсё астатняе прыйдзе.

«Сяброўства паміж мужчынам і жанчынай магчымае».

Калі вельмі моцна верыць і чакаць цудаў, то яны абавязкова здараюцца. Фільм «Усё, што нам трэба...» можна лічыць проста чарговай варыяцыяй на тэму «Каханне — аснова ўсяго», пакуль не пачынаеш разумець, што ўсё неадназначна. Акрамя белага і чорнага колераў, у жыцця існуе безліч адценняў. І толькі тыя людзі, якія даражаць намі, здольны дапамагчы нам у барацьбе з абставінамі. Як кажа гераіня Святланы Зелянкоўскай: «Нашы каханыя заўсёды ў нашых думках і ў сэрцы. І ўсё, што нам трэба, — проста быць побач... А калі гэтага няма, то навокал шэрая цемра, холад і няма чым дыхаць»... Хто ведае, можа, у гэты Новы год і вы сустрэнеце героя свайго рамана? Выпадковасць — гэта ж псеўданім Бога, калі той не хоча падпісвацца. І калі свет уратуецца не прыгажосцю, то абавязкова — каханнем!

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

■ Будзь у курсе!

ЯК НЕ СПАЗНІЦЦА НА СВЯТА І... ДАДОМУ?

25-27 снежня сталічны метрапалітэн будзе працаваць па графіку нядзельнага дня. 31 снежня паязды будуць курсіраваць па раскладзе пятніцы, пасля 22 гадзін і да 4 гадзін раніцы інтэрвал паміж імі складзе 6,5-7 хвілін.

У навагоднюю ноч работу метрапалітэна падоўжаць да 4.15, а станцыі «Няміга», «Фрунзенская» і «Кастрычніцкая» будуць прымаць апошніх пасажыраў некалькі пазней — да 4.25. Ранкам 1 студзеня метрапалітэн пачне працаваць у 5.30. 1-3 студзеня цягнікі будуць курсіраваць у падземцы па графіку нядзельнага дня. Гэты ж графік будзе дзейнічаць і 7-10 студзеня. На выпадак павелічэння пасажырапатоку ў метро будуць напагатове рэзервныя саставы на абедзвюх лініях.

Па інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», у навагоднюю ноч 1 студзеня з 0 да 5 гадзін будзе арганізавана работа маршрутаў камунальнага пасажырскага транспарту: 18 аўтобусных, 10 тралейбусных і 2 трамвайных. Інтэрвал руху ў гэты час складзе, напрыклад, на аўтобусным маршруце №1 «ДС «Вяснянка — Вакзал» 10 хвілін, №100 «ДС «Славінскага — Аэрапорт «Мінск-1» — 11 хвілін. Чакаць аўтобусы іншых маршрутаў давядзецца пераважна ад 15 да 20 хвілін. З такой жа перыядычнасцю будзе курсіраваць і большасць тралейбусных маршрутаў: №6 «ДС «Лошыца-2 — Вакзал», №29 «ДС «Каліноўскага — пл. Мяснікова» і інш. Два тралейбусныя маршруты — №3 «Возера — Серабранка» і №11 «ДС «Зялёны Луг — пр. Незалежнасці» развязуць пасажыраў з інтэрвалам у 10 хвілін.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Прыгоды з каларытам

Можна параіць для прагляду яшчэ на два фільмы рэжысёра Івана Паўлава, якія таксама прасякнуты атмасферай навагодніх свят. Першая кінакамедыя «Свежына з салютам» (2001), а другая гісторыя — «Навагоднія прыгоды ў ліпені» (2008).

«Свежына з салютам».

Калядная камедыя **«Свежына з салютам»** — гэта аповед пра двух прыяцеляў, Язэпа і Сцяпана, якія жывуць у адной вёсцы. Першы — аматар рыбачыць і паляваць, а другі вядомы ў вёсцы майстар на ўсе рукі. А пачынаюцца ўсе прыгоды з прыездам Анатоля (сына Сцяпана). Навяспечаны лейтэнант атрымаў трохдзённы водпуск для жаніцьбы. Перадвясельныя клопаты ў вёсцы і становяцца падставай для вясёлай блытаніны і мітусні... У фільме зняліся Генадзь Аўсяннікаў, Вольга Клебановіч, Вольга Петрачкова, Яўген Лявонцьеў і іншыя акцёры. У іх кампаніі фільм працягласцю ў гадзіну з лішнім праляціць як адно імгненне.

І, калі раптам пажадаеце працягу, то глядзіце карціну **«Навагоднія прыгоды ў ліпені»** (пры яе стварэнні Іван Паўлаў працаваў у тандэме з рэжысёрам Аленай Тураваў). Сярод акцёрскага складу Ігар Бочкін, Ліза Лазарэвіч, Марыя Забара, Васіль Кубекін, Сяргей Журавель, Данііл Співакоўскі... Прыгоды, добрая музыка і камп'ютарныя эфекты складаюць аснову фільма. Яго можна глядзець усёй сям'ёй альбо ў вясёлай кампаніі сяброў. Тады ўсе змогуць даведацца, што ліхадзеі, якія не любяць Новы

«Навагоднія прыгоды ў ліпені».

год, нават летам на варце. Нашы юныя героі «перанясуцца» ў віртуальны свет, каб прадухіліць страшную змову зламыснікаў, якія хочуць знішчыць усе святы на нашай планеце. Калі нейкім святам дзеці і гатовы ахвяраваць, то Дзеда Мароза і Снягурку будуць абараняць да апошняга. А ўлічваючы, што нашы юныя героі добра арыентуюцца ў віртуальным свеце, ліхадзеям прыйдзецца нясоладка. Але ці ўдасца дабру чарговы раз перамагчы зло? І ці на ўсё гатовы дзеці, каб любімыя святы засталіся на сваіх месцах і працягвалі радаваць зямлян?

«НАВАГОДНІ ФЭСТ ПРЫСМАКАЎ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

КУХОННЫ КАМБАЙН BOSCH MUM54240

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2016 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 14 СТУДЗЕНЯ 2016 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 15.01.2016 года будзе разыграна 7 мультыварак OURSSON і суперпрыз — кухонны камбайн Bosch. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25.01.2016 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.03.2016 г. пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2016 г. і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» чытайце ў №238 газеты «Звязда» ад 09.12.2015 г.

Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.
ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 12.12.2015 ПА 31.03.2016.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2691 ад 07.12.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал 2016 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на I кв. 2016 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Разгарну «Звязды» старонкі — Бачу родную старонку!

Як жыве яна, працуе,
Як зямля яе красуе.
Бачу, як адпачывае —
Людцаў песнямі вітае.
І што ўрад там вырашае —
Мне «Звязда»
распавядае...
Тут вучуся сад садзіць,
Нешта смачнае варыць.
Разам з ёй у падарожжа
Выпраўляцца можа кожны.
«Мову простую» люблю
(нават выразкі раблю).
...Аб усім, што ёсць
у свеце,
Прачытаю ў газеце.
З ёю душой адпачываю —
Мудрасць продкаў
спасцігаю!

Акцыі «Падпісаўся на «Звязду» — сагітуй суседа!» рэдакцыя пакуль не аб'яўляла (хоць, напэўна, і варта было б)... А працэс агітацыі між тым (мяркуючы па нашай пошце) ішоў. І ідзе... Хораша, згадзіцеся!

А яшчэ лепш — уступайце ў своеасаблівы клуб аматараў, прыхільнікаў роднай мовы і «Звязды», выпісвайце газету на наступны месяц (два, тры альбо паўгоддзе) і разам са **спадарыняй Валянцінай Гудачковай з Жыткавіч** пяць разоў на тыдзень разгортвайце старонкі любімай «Звязды».

Да канца падпіскі — нагадаем — часу застаецца няшмат.

АХМІСТРЫНЯ З ІМПЭТАМ

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

Ахмістры́на (устарэлае) — жанчына, якая вядзе гаспадарку ў багатым доме. *Ахмістрыня на сучасны лад — тая самая эканомка.*

Ралля́ — узаранае поле, глеба. *Па-руску: пашня.*

Імпэ́т (адно са значэнняў) — пыл, пылкасць, імкненне. *Імпэт да працы.*

Скі́ба — адрэзаны вялікі плоскі кавалак хлеба. *«Дзядзька падносіць ім тлустае сала, рэжа таўшчэзнымі скібамі хлеб»*, — чытаем у Пятра Прыходзькі.

Перакасава́ць — закрэсліць зусім, цалкам. *Перакасаваць можна верш, старонку рукапісу.*

Стрыва́ць — цярпліва паставіцца да чаго-небудзь. *Стрываць боль.*

Хоць у пятлю лезь — дайсці да складанага, безвыходнага становішча. Яшчэ беларусы скажуць: хоць кладзіся і памірай, хоць у вір галавой. Рускія — хоть в омут головой.

Мазаць дзёгцем — незаслужана зневажаць некага, няславіць. Беларускія сінонімы — вешаць сабак, выліваць памыі. Рускі — обливать грязью. Выраз «мазаць дзёгцем» узнік згодна з даўнейшым звычаем мазаць дзёгцем у начны час вароты гаспадару, намякаючы гэтым самым на якую-небудзь ягоную правіннасць ці членаў яго сям'і і тым самым ганьбячы іх.

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

ЦУДЫ «НЕ ПА ФАРМАЦЕ» НА АНТ

У Новы год адбываюцца незвычайныя і нечаканыя падзеі, бо гэта самая чароўная ноч у годзе. У гэтае свята гледачам тэлеканала АНТ будзе цёпла ад добрых пажаданняў, гарачых танцаў, бліскучых жартаў і любімых песень.

У навагоднюю ноч тэлеканал АНТ прапануе гледачам вялікую порцыю добрага гумару ад тэлевядучых і сцэнарыстаў. Яўген Булка, Дзмітрый Шунін, Максім Сокал, Люцыя Лушчык, Яўген Крыжаноўскі сустрэнуць Новы год у рабочай абстаноўцы, ва ўтульным загарадным комплексе. Гледачоў чакае незвычайны эксперымент найлепшых крэатыўных рэжысёраў і кліпмэйкераў, адрыў ад звыклай навагодняй бяседы. Рэалізаваць самыя смелыя ідэі аўтараў дапамогуць вядомыя артысты: Алёна Ланская, Аляксей Грос, Дарыя, Ганна Шаркунова, Дзядзька Ваня, «Тяни-Толкай», Віталь Карпанаў, Герман, група «Без Білета». Правядзіце навагоднюю ноч у добрай кампаніі з тэлеканалам АНТ і загадвайце жаданне. Яно абавязкова збудзецца!

ПАНЯДЗЕЛАК, 28 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 22.45 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Серыял «Здрада».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05 Камедыя «Клушы».
13.25, 15.50 Меладрама «Другі шанц». 1—4-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.40 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
20.00, 21.45 Дэтэктыў «Аперацыя «Тайфун». Заданні асобай важнасці». 1—2-я серыя.
21.00 Панарама.
23.25 Дзень спорту.
23.35 Меладрама «Папялушка з райскага вострава».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.10, 21.05 Тэлебарометр.
9.05 «Арол і Рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
10.45 М/с «Сябры анёлаў».
11.15 «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
11.50 «Разбуральнікі міфаў».
13.00 «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
14.15 Меладрама «Калядная казка».
16.55 Перазагрузка.
17.55, 1.00 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
18.55 Серыял «Кухня».
19.55 Серыял «Васьмідзясятыя». Заключныя серыі.
21.10 «Чалавек-нябачнік». Рэаліці-шоу. Першы выпуск.
22.10 КЕНО.
22.15 «Арол і Рэшка». Трэвел-шоу.
23.20 Рэпарцёр.
0.10 Серыял «Косці».

БЕЛАРУСЬ 3

7.20, 13.00, 18.35, 23.20 «Калейдаскоп».
7.35 «Сусветная карцінная галерэя».
8.05 «Пан Валадыёўскі». Драма.
10.40 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
11.30 «Наперад у мінулае».
12.00, 21.00 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
12.35 «Свет прыроды». Маленькі зімовы сюжэт. Дак. фільм.
12.45 «Свет прыроды». Лясны прыгажун. Дак. фільм.
13.15 «Сувораў». Маст. фільм.
15.00 «Музыкант». Піяніст, народны артыст Расіі Дзяніс Мацуеў. Дак. фільм.
15.50 «І класіка, і джаз». Канцэрт піяніста-віртуоза Дзяніса Мацуева.
17.00 «Павадыр». Меладрама.
18.50 «Другое неба». Дак. фільм.
19.25 «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка». Драма.
20.40 «Калыханка».
21.35 «Аркестр тваёй краіны». Да 85-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.
22.55 «Камертон». Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча Міхаіл Казінец.
23.35 «Геапалітыка: свет за тыдзень».

БЕЛАРУСЬ 5

7.30, 18.55 PRO спорт. Навіны.
7.40 Баскетбол. НБА. «Мілуокі» — «Таронта».
9.35 Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. Другі этап. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
11.30 Авертайм.
12.00 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Беларусь — Славакія.
14.00 Хакей для ўсіх.
14.40 Спорт-мікс №12.
15.05 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Славакія — Чэхія.
17.25 Спорт, спорт, спорт. Кур'ёзы ў спорце.
18.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
19.05 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Расія — Фінляндыя.
21.20 PRO спорт. Вынікі.
21.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Чэлсі».
23.40 Нашы перамогі-2015. Еўрапейскія гульні ў Баку.
0.10 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!»
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.15 «Смак».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.05 «Сам-насам з усімі».
15.00 «Міхаіл Баярскі. Адзін на ўсіх».
16.20 «Адгадай мелодыю».
16.55 «Давай пажэнімся!»
18.20 «Адваротны адлік». «Айзек з Пятровічаў. Успомніць будучыню».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Часова недаступны».
23.05 Серыял «Навагодні рэйс».
1.00 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Мінскчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Вялікае сняданне».
10.00 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.35 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 Фантастыка «Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца. Частка I».
15.55 «Іншая краіна». «Узбекістан: месца пад сонцам».
16.50 «Вялікі горад».
18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Не памерці, дык павіцца».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Баявік «Бэтмен назаўсёды».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 «Ваенная тайна».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Даведнік».
9.10 «Беларусь сёння».
9.40 Маст. фільм «Мы з джаза».
11.20 Маст. фільм «Тэрмінова патрабуецца Дзед Мароз».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».
16.20 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50, 3.50 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Шчасліўчык Пашка».
19.25 Серыял «Развод».
22.05 Маст. фільм «Год залатой рыбкі».
23.55 Галоўная тэма.
0.05 Ток-шоу «Слова за слова».
1.00 Маст. фільм «Той самы Мюнхгаўзен».
3.15 «Любімыя акцёры».
4.15 Маст. фільм «Будзь, што будзе».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 Ток-шоу «Што адбываецца».
12.40 «Пакой смеху».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 «Наш чалавек».
18.20 Серыял «Каменская».
20.55 Серыял «Земскі доктар».
21.55, 23.10 Серыял «Усё могуць каралі».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 Дэтэктыў «Адвакат».
7.10 «Акцэнты тыдня».
8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.20 Серыял «Асноўная версія».
13.15 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.55 «Ядзім дома».
14.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
16.20 Серыял «Ліцейны».
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Дэтэктыў «Аргенціна».
23.10 «Анатомія дня».
23.50 Камедыя «Пра каханне».
1.30 Цэнтр дапамогі «Настасся».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.55 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.20 «Раство з героямі серыяла». Міс Фрайні Фішэр.
8.20 Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію».
10.00, 16.30 «Аналітычная праграма».
10.10 Камедыя «Птушыная клетка».
12.05 М/ф «А Баба-яга супраць».
12.30 «Кінаблакнот».
12.45, 13.50, 15.45, 16.40, 18.25, 19.35, 21.00 «Хатняя крама».
13.00 Серыял «Героі».
14.10 Серыял «Палюбоўніцы».
17.00 Серыял «Пад купалам».
18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».
19.50 Серыял «Бібліятэкары».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Баявік «Праўдзівая хлусня».
23.30 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».

ВТВ

6.00, 17.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
6.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
8.00 Серыял «Вароніны».
9.00 Серыял «Маладзёжка 3».
11.00 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі».
13.30 Серыял «Ералаш».
14.00 Серыял «Паласатае шчасце».
15.00, 4.00 Серыял «Нефармат».
17.00 «Лаві момант».
18.00, 23.30 Скетчком «Сям'я 3D».
19.00 Камедыя «Нявеста з запраўкі».
21.10 Меладрама «Зменлівасці кахання».
0.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15 «Залатое цяля». Маст. фільм.
14.00 «Яўген Еўсцігнееў. Еўсці-Геній». Дак. фільм.
14.45 Важныя рэчы. «Латы Лжэдзмітрыя».
15.10, 23.50 «Лэдзі знікае». Маст. фільм.
16.35 Да 80-годдзя з дня нараджэння Джэмы Фірсавай. «Сны вяртанняў». Дак. фільм.
17.20 Падзеі года. XV Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Урачыстае закрыццё і гала-канцэрт лаўрэатаў.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.00 Юбіляры года-2015. Жарэс Алфёраў. Лінія жыцця.
20.55 «Саці. Нясумная класіка...». Навагодні выпуск.
21.50 «Кіно — справа тонкая. Уладзімір Матыль». Дак. фільм.
22.30 «Піяна Гайз». Канцэрт у Рэд Бутэ Гардэн.
23.45 Мастсавет.
1.20 Аркестравыя мініяцюры XX стагоддзя. Дзяржаўны сімфанічны аркестр «Новая Расія».
1.40 «Алеі Буніных». Дак. фільм.
2.30 Арыі з оперы М. Мусаргскага «Барыс Гадуноў».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1992. Паўтор ад 2010 года.
7.00, 8.15, 11.10, 12.50, 14.55, 17.15, 18.55, 19.45, 21.40, 23.00, 1.05, 2.35, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.40 Дак. фільм «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў».
9.00 «Быў час». 2008 год.
10.00, 16.00 Маст. фільм «Новыя прыгоды Янкі пры дварэ караля Артура».
12.00 «Акулы пяра». Валерый Лявонцьеў. 1995 год.
13.30 Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю!».
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рэстаранная культура». Любоў Успенская. 2005 год.
19.20 Маст. фільм «Дзяўчынка з буксіра».
20.45, 2.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
21.00, 3.00 «Мінулы час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
1.30 Маст. фільм «Начны матацыкліст».
4.00 «Колба часу».

EUROSPORT 1

5.00, 7.15, 9.15, 16.30, 19.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
11.15, 13.30, 18.00, 23.00, 2.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Турнэ 4-х трамплінаў. Найлепшыя моманты.
12.15, 14.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
20.30, 2.00 Біятлон. Сусветны камандны выклік (Калядная гонка зорак).
22.00, 3.30 Футбол. Веліч футбола.
0.00 Timbersports. Чэмпіянат свету.
1.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Найлепшыя моманты.

КАМЕДЫЯ

6.00 Серыял «Кёрсці».
6.25 Камедыя «Гэта пройдзе, але калі?».
8.00 Камедыя «Дзве калядныя сабакі».
9.40, 17.50, 22.00, 3.10 Серыял «Пакетная здзелка».
10.35 Камедыя «Махляры».
12.20 Камедыя «Молі і Мопс».
14.00, 14.50, 15.40, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
14.20, 15.10 «Камедыянты (Шоу)».
16.00 Камедыя «Пенелопа».
18.45 Камедыя «Хачу як Брыджэт».
20.20 Камедыя «Цяжарны».
23.10 Меладрама «Двое — гэта занадта».
1.05 Камедыя «Усмешка Бога, ці Чыста адэская гісторыя».
4.00 Камедыя «Востраў скарбаў».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.50 «Доктар І...»
8.15 «Чалавек каля акна».
9.50, 3.45 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.40, 4.30 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.35 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.30 «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
13.25 «Мільянер».
15.20, 3.00 «Нераскрытыя таямніцы».
16.15 «Мой герой».
17.05, 5.20 «Пяць гісторый пра каханне». Дак. фільм.
18.00 «Чалавек-прынада». Серыял.
19.00, 1.30 «Трава пад снегам». Серыял.
20.55, 0.45 «Неспакойны ўчастак». Серыял.
21.55 «Выратуйце нашы душы». Серыял.
22.55 «Часова даступны».
23.55 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.00 Драма «Мех: Уяўны партрэт Дзіяны Арбус».
8.00 Трагікамедыя «Шукаю сябра на канец свету».
9.40, 4.30 Фэнтэзі «Гары Потэр і вязень Азкабана».
12.00 Меладрама «Крок наперад: Усё або нічога».
13.55 Меладрама «Блізкасць».
15.40 Баявік «Прафесіянал».
17.40, 2.00 Прыгоды «Маска Зора».
20.00 Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
22.10 Фэнтэзі «Як злавіць монстра».
0.20 Дэтэктыў «Перш чым я засну».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Балі Валтасара, або Ноч са Сталіным».
7.55 Драма «Старэйшая жонка».
9.35 Камедыя «Тата напракат».
11.20 Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».
13.10 Драма «Шык».
14.50 Казка «Тайна чатырох прынцэс».
16.25 Камедыя «Мамы 3».

18.00 Камедыя «Ёлкі 1914».
20.20 Баявік «22 хвіліны».
21.50 Камедыя «Вясёлая моладзь».
23.30 Камедыя «Вяселле па абмене».
1.05 Драма «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
2.25 Камедыя «Па вуліцах камоду вадзілі...»
3.40 «Што ў Сенькі было». Прыгоды.
4.55 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 3.45 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
6.50, 13.45 Гульні розуму.
7.10 Папулярная навука.
7.35, 13.20 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Незвычайныя промыслы
8.45 Тэхаскі ўлоў.
9.30, 14.10, 19.30 Культ Марыі.
10.20, 14.50, 20.15 Страчаная рэлігія Хрыста.
11.00, 12.35, 17.10 Сканеры старажытнага свету.
11.50 Ледзяная дарога.
15.40 У аб'ектыве: незвычайныя паводзіны жывёл.
16.25 Даліна Грызлі, або Поле бітвы — Елаўстоун.
18.00 Мегазаводы.
18.40, 21.45, 0.00, 1.30, 5.15 Расследаванні авіякатастроф.
21.00, 0.45, 4.30 Цунамі.
22.30 Паранармальнае.
23.15 Эвакуацыя Зямлі.
3.00 Паветраныя асы вайны.

DISCOVERY

8.00, 12.30 Дарожныя каўбоі.
8.50 Нябачныя светы.
9.45, 14.20, 21.30 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.45, 21.00 Як гэта зроблена?
10.40, 17.05 Прапажы на продаж.
11.35, 1.00, 7.10 Гульня на жыццё.
13.25, 19.00, 6.25 Не спрабуйце паўтарыць.
15.15, 5.35 Хуткія і гучныя.
16.10, 3.00 Махінатары.
18.00 Супермаг.
20.00 Эфект Карбанара.
22.00 Дзікая кухня.
23.00 Голыя і напалоханыя.
2.00, 4.50 Бітвы за кантэйнеры.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

АЎТОРАК, 29 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.00 Зона Х.
9.10 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00 Серыял «Здрада».
12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.15 Дэтэктыў «Ахоўныя асобы».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.20 Сфера інтарэсаў.
20.00, 22.05 Дэтэктыў «Аперацыя «Тайфун». Заданні асобай важнасці».
21.00 Панарама.
21.45 Спецыяльны рэпартаж.
0.00 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 22.15 «Арол і Рэшка». Трэвел-шоу.
10.10, 16.20 Трылер «Закрытая школа».
11.15, 0.15 Серыял «Косці».
12.15, 21.10 «Чалавек-нябачнік». Рэаліці-шоу.
13.15 Серыял «Васьмідзястыя» Расія. Заключныя серыі.
14.25, 18.55 Серыял «Кухня».
15.30, 23.25 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
17.55, 1.05 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
20.00 Серыял «Шурачка». 1—2-я серыі.
22.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.

БЕЛАРУСЬ 3

7.20, 13.20, 19.05, 0.10 «Калейдаскоп».
7.35 «Сусветная карцінная галерэя».
8.05 «Павадыр». Меладрама.
9.40 «Камертон». Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча Міхаіл Казінец.
10.05 «Аркестр тваёй краіны». Да 85-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.
11.30, 23.40 «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта-песенніка Аляксандра Лягчылава.
11.55 «Прыватнае жыццё Дон Жуана». Меладрама.
13.35 «Гітара па крузе». Паэт, музыкант, аўтар-выканаўца Алена Гудкова.
14.30 «Сіндбад». Прыгоды.
16.05 «Снежная каралева». М/ф.
17.05 «Айбаліт-66». Камедыя.
18.40 «Раман з лёсам». «Кошкімышкі, Чыжыкаў». Дак. цыкл.
19.20 «Яшчэ кахаю, яшчэ спадзяюся...» Меладрама.
20.40 «Калыханка».
21.00 «Песні навагодніх начэй». 90-я гады.
21.30 «Запрашаем на Бяседу».
22.50 «Вандроўка з «Бяседай».

БЕЛАРУСЬ 5

7.00 PRO спорт. Вынікі.
7.30 Баскетбол. НБА. «Мемфіс» — «Лейкерс».
9.20 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Славакія — Чэхія.
11.10 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Расія — Фінляндыя.
13.00 Спорт-мікс №13.
13.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Чэлсі».
15.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Уотфард» — «Тотэнхэм».
17.05 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Беларусь — Расія.
19.20 PRO спорт. Навіны.
19.30 Спорт, спорт, спорт. Мікалай Дранько.
20.00 Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
20.30 Спорт-кадр.
21.05 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Швейцарыя — Канада (у перапынках — PRO спорт. Навіны).
23.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Манчэстэр Сіці».
1.10 Нашы перамогі-2015.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.15 «Смак».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 Серыял «Навагодні рэйс».
16.20 «Адгадай мелодыю».
16.55 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Татавы дочкі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Часова недаступны».
23.00 Серыял «Навагодні рэйс».
0.55 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Кіндэрвілейскі прывід».
10.10 «Далёкія сваякі».
10.40, 17.35 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!»
13.50 «Наша справа».
14.05 «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным». «Сезон цудаў».
15.05, 23.40 «Белыя ваўкі». Серыял.
16.50 «Цэнтральны рэгіён».
18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Прыгажосць з вялікай дарогі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Баявік «Бэтмен і Робін».
23.00 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
23.20 «Аўтапанарама».
1.10 «Калыска чалавецтва: выкрадзеная праўда». Дакументальны спецпраект.

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 1.00 М/ф «Прыгонная актрыса».
11.20, 2.40 Маст. фільм «Забіць карпа».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 19.25 Серыял «Развод».
15.05 «Справы сямейныя».
16.20, 4.20 Дак. серыял «Іншы свет».
16.50, 4.40 Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
17.20 Серыял «Шчасліўчык Пашка».
21.10 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».
22.05 Маст. фільм «Мужчына ў маёй галаве».
23.55 Галоўная тэма.
0.05 Ток-шоу «Слова за слова».
1.00 Маст. фільм «Прыгонная актрыса».
5.05 Дак. фільм «Тайны часу».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Пакой смеху».
12.10 Маст. фільм «Кожны за сябе».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.30 «Прамы эфір».
17.30 «Наш чалавек».
18.20 Серыял «Каменская».
20.55 Серыял «Земскі доктар».
21.55, 23.10 Серыял «Усё могуць каралі».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 Дэтэктыў «Адвакат».
7.10 «Новыя рускія сенсацыі».
8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.20 Серыял «Асноўная версія».
13.15 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
13.55 «Справа густу».
14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
16.20 Серыял «Ліцейны».
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.40 Дэтэктыў «Дарагая».
23.10 «Анатомія дня».
23.50 Камедыя «Алмаз у шакаладзе».
1.30 Цэнтр дапамогі «Настасся».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.55 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.50 Серыял «Біблія-тэкары».
8.30, 18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».
9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.40, 18.25, 19.35, 21.00 «Хатняя крама».
9.45 «Аповеды пра жывёл». Сабакі.
10.10 «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
11.10 Камедыя «Ой, мароз, мароз!».
12.45, 16.30 «Кінаблакнот».
13.00 Серыял «Героі».
14.10 Серыял «Палюбоўніцы».
17.00 Серыял «Пад купалам».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.20 Камедыя «Вяселле майго найлепшага сябра».
23.15 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».

ВТВ

6.00, 17.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
6.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
7.00 М/ф «Смяшарыкі».
7.30, 23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
8.00 Серыял «Вароніны».
9.00, 18.00, 23.30 Скетчком «Сям'я 3D».
10.00 Камедыя «Нявеста з запраўкі».
12.00 Меладрама «Зменлівасці кахання».
14.00 Серыял «Паласатае шчасце».
15.00, 4.00 Серыял «Нефармат».
17.00 «Лаві момант».
19.00 Меладрама «Астравы».
21.10 Камедыя «Палярны рэйс».
0.30 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Наглядальнік».
11.15 «Шлягеры савецкага экрана. Аперэта». «Сільва». Маст. фільм.
12.40 «Сяргей Марцінсон». Дак. фільм.
13.25, 22.05 Ганна Нятрэбка, Эліна Гаранча, Рамон Варгас і Людовік Тэзье ў гала-канцэрце ў Бадэн-Бадэне.
14.50 «Уільям Гершэль». Дак. фільм.
15.10, 23.50 «Містар Валарэ. Каханне і музыка Даменіка Мадуньё». Маст. фільм. 1-я серыя.
17.05 Падзеі года. Ланг Ланг у Маскве. Канцэртная зала імя П.І. Чайкоўскага.
19.05 «Фідзій». Дак. фільм.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.00 Юбіляры года-2015. Яўген Рэйн. Лінія жыцця.
20.55 «Юрый Нікулін. Класіка жанру».
21.20 «Залатое цяля». З такім шчасцем — і на экране». Дак. фільм.
23.45 Мастсавет.
1.40 «Pro memoria». «Венецыянскае шкло».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Валерый Лявонцьеў. 1995 год.
6.50, 8.55, 11.10, 12.50, 13.45, 15.40, 17.00, 18.40, 20.30, 21.40, 23.00, 1.00, 2.15, 5.10 Музычная настальгія.
7.30 Дак. фільм «Вельмі Вас усіх люблю!».
10.00, 4.00 Маст. фільм «Новыя прыгоды Янкі пры дварэ караля Артура».
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Рэстаранная культура». Любоў Успенская. 2005 год.
13.20 Маст. фільм «Дзяўчынка з буксіра».
14.45, 20.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
18.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Генадзь Хазанаў.
19.10 Маст. фільм «Гамбрынус».
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1992. 2-я частка. Паўтор ад 2010 года.
1.40 Дак. фільм «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў».
3.00 «Быў час». 2008 год.

EUROSPORT 1

5.00, 11.15, 17.45 Скачкі на лыжах з трамплiна. Турнэ 4-х трамплінаў. Найлепшыя моманты.
6.15, 9.30, 12.15, 15.15, 17.15, 22.15, 0.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
7.15, 1.15 24 гадзіны Ле-Мана. Найлепшыя моманты.
8.15 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
10.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
13.30, 16.30, 21.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
19.00, 23.00, 2.15 Скачкі на лыжах з трамплiна. Турнэ 4-х трамплінаў.
1.00 Акадэмія GT. Аўтаспорт.
3.30 Сусветныя галы.

КАМЕДЫЯ

6.00, 22.30 Серыял «Кёрсці».
6.25 Камедыя «Дзве калядныя сабакі».
8.00 Камедыя «Молі і мопс».
9.40, 17.50, 22.00, 3.00 Серыял «Пакетная здзелка».
10.35 Камедыя «Пенелопа».
12.20 Камедыя «Хачу як Брыджэт».
14.00, 14.50, 15.40, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
14.20, 15.10 «Камедыянты (Шоу)».
16.00 Меладрама «Двое — гэта занадта».
18.50 Камедыя «Цяжарны».

20.20 Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
23.10 Камедыя «Вайна гузікаў».
1.10 Камедыя «Махляры».
3.55 Камедыя «Усмешка Бога, ці Чыста адэская гісторыя».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.45 «Доктар І...»
8.15, 19.00, 1.25 «Трава пад снегам». Серыял.
9.50, 3.40 «Судовыя страсці». Дак. серыял.
10.40, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.35 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.30 «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
13.30, 18.00 «Чалавек-прынада». Серыял.
14.30 «Простыя складанасці».
15.05, 2.55 «Нераскрытыя тайны».
16.05 «Мой герой».
16.55, 21.55 «Выратуйце нашы душы». Серыял.
20.55, 0.40 «Неспакойны ўчастак». Серыял.
22.55, 5.15 «Зорныя гісторыі».
23.50 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

7.00 Драма «Марыя Сцюарт».
9.10, 4.05 Фэнтэзі «Гары Потэр і Кубак Агню».
11.50 Прыгоды «Маска Зора».
14.10 Камедыя «Перш чым я пайду».
15.50 Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
17.50 Меладрама «Джэйн Эйр».
20.00 Меладрама «Яна».
22.05 Баявік «Напруж звілiны».
23.55 Фантастыка «Дывергент».
2.15 Трылер «Тэорыя змовы».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Маст. фільм «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
7.50 Драма «Люстэркі».
10.10, 4.55 Меладрама «Кітайская бабуля».
11.45 Драма «Аповесць непагашанага месяца».
13.15 Драма «Палёты ў сне і наяве».
14.55 Камедыя «Ёлкі лахматыя».
16.30 Меладрама «Кахае не кахае».
18.00 Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».
20.20 Меладрама «Атамны Іван».
22.30 Камедыя «Ч, Б».
0.05 Камедыя «Бясслаўныя прыдуркі».
1.50 Камедыя «За двума зайцамі».
3.10 Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 17.10, 3.45 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
6.50, 13.45, 18.00, 21.00, 0.45, 4.30 Гульні розуму.
7.10 Папулярная навука.
7.35, 13.20 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Культ Марыі.
8.45 Страчаная рэліквія Хрыста.
9.30, 14.10, 19.30 Цунамі.
10.20, 14.50, 20.15, 0.00, 2.15 Расследаванні авіякатастроф.
11.00 Сканеры старажытнага свету.
11.50 Ледзяная дарога.
12.35 Будаўнічая ліхаманка.
15.40 У аб'ектыве: незвычайныя паводзіны жывёл.
16.25 Мядзведзі востраў Страху.
18.40, 21.45, 1.30, 5.15 Як перамагчы ва ўсім.
22.30 Паранармальнае.
23.15 Уварванне на Зямлю.
3.00 Абаронцы культурнай спадчыны.

DISCOVERY

8.00, 12.30 Хуткія і гучныя.
8.50 Не спрабуйце паўтарыць.
9.45, 14.20, 21.30 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.45, 21.00 Як гэта зроблена?
10.40, 17.05 Бітвы за кантэйнеры.
11.35, 7.10 Рачныя монстры.
13.25, 6.25 Аэрапорт знутры.
15.15, 1.00, 5.35 Круты цюнінг.
16.10, 3.00 Махінатары.
18.00 Голыя і напалоханыя.
20.00 Дзікая кухня.
22.00 Мяцежны гараж.
23.00 Страсць да матораў.
0.00 Вулічныя гонкі.
2.00, 4.50 Іржавая імперыя.
4.00 Маланкавыя катастрофы.
4.25 Сапраўдныя аферысты.

ФЛЭШМОБ З «ДВОЙКАЙ»

«Беларусь 2» віншуе ўсіх сваіх тэлегледачоў з надыходам зімовых свят. Тэлеканал увесь год стараўся радаваць і здзіўляць сваю аўдыторыю. Святочныя эфіры таксама пройдуць у кампаніі нечаканых гасцей, вядомых фільмаў і любімых вядучых.

Увесь тыдзень напярэдадні Новага года праграма «Тэлераніца» будзе дарыць гледачам свае сюрпрызы. Арцеміс Ахпаш, Ілья Конанаў, Віталь Карпанаў і Дзмітрый Карась разам з Вольгай Жураўлёвай будуць будзіць вас і рыхтаваць да навагодніх свят. Інтэрактыўны маладзёжны праект «ПІН_КОД» 31 снежня з'явіцца ў эфіры тройчы: у 13.00, у 15.20 і ў 18.20. У спецыяльным святочным выпуску збяруцца ўсе вядучыя праекта. Ім традыцыйна будуць дапамагаць карэспандэнты, не абыдзецца і без зорных гасцей. А яшчэ гледачоў чакае неонавае шоу, бітва дыджэяў і спецыяльны флэшмоб, уключэнні ў фармаце святочных відэапаштовак з розных краін свету.

Навагодняя ноч пачнецца ў 23.05 і стане сімвалічным музычным завяршэннем Года моладзі ў краіне. У сучаснай версіі класічнага «Блакітнага агеньчыка» прымуць удзел артысты Дзмітрый Калдун, Юзары, Тэа, Ганна Шаркунова, гурты Da Vinci, «Інжыр» і іншыя. Менавіта ў навагоднюю ноч у эфіры «Беларусь 2» чакайце прэм'еру гімна — музычнай візіткі тэлеканала ў выкананні вядучых і яе аўтара Віталя Карпанава.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАЛАРЫТ — НА «БЕЛАРУСЬ 3»

Падчас свят культуралагічны тэлеканал «Беларусь 3» будзе ствараць казачны навагодні настрой для маленькіх гледачоў, а дарослыя змогуць атрымаць асалоду ад гучання нацыянальнай музыкі — у навагоднюю ноч і перадсвяточныя дні. І, вядома, якія калядныя святкаванні без дарагіх сэрцу фільмаў?

Серыю навагодніх канцэртаў з нацыянальным каларытам 29 снежня на «Беларусь 3» распачне канцэртная праграма **«Запрашаем на «Бяседу».** Нават калі глядач не з'яўляецца аматарам фальклору, то ўсё роўна не зможа застацца абыякавым, калі загучаць вядомыя песні «Чарка на пасашок», «За маладых», «Запрагайце, хлопцы, коней» і іншыя.

30 снежня на канале святочны парад фільмаў для дзяцей і дарослых. У гэты ж дзень «Беларусь 3» падрыхтаваў для сваіх гледачоў яшчэ адзін незвычайны фолк-падарунак — **канцэрт гурта «Стары Ольса». 31 снежня** фолк-рокавую хвалю падхопіць **гурт «Палац».** Канцэртныя праграмы вытворчасці Белтэлерадыёкампаніі **«Скарбонка навагодніх пацех»** (1998) і **«У гасцях у Дзеда Мароза»** (2004) таксама стануць цудоўнымі падарункамі ў эфіры «Беларусь 3» у апошні дзень гэтага года і «акунуць» гледачоў у сапраўднае беларускае рэтра.

На «Беларусь 3» нас чакае шмат сюрпрызаў! Адным з іх стане **«Калыханка» для дарослых»** у апошні дзень года. У ноч **з 31 снежня на 1 студзеня** Новы год сустракаць з гледачамі будуць ансамбль народнай музыкі «Бяседа», вакальны гурт «Чысты голас», Ірына Відава, Аляксей Хлястоў і вядучыя «Беларусь 3» Анатоль Длускі, Вольга Сацюк і Кірыл Ермакоў.

СЕРАДА, 30 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.00 Зона Х.
9.10 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00 Серыял «Здрада». Заключная серыя.
12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
13.10 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.15 Дэтэктыў «Ахоўныя асобы».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.20 Сфера інтарэсаў.
20.00, 22.05 Дэтэктыў «Аперацыя «Тайфун». Заданні асобай важнасці». Заключная серыя.
21.00 Панарама.
21.45 Актуальнае інтэрв'ю.
0.00 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 22.15 «Арол і Рэшка». Трэвел-шоу.
10.15, 16.20 Трылер «Закрытая школа».
11.20, 23.50 Серыял «Косці».
12.20, 21.10 «Чалавек-нябачнік». Рэаліці-шоу.
13.25, 20.00 Серыял «Шурачка».
14.25, 18.55 Серыял «Кухня».
15.30, 23.05 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
17.55, 0.40 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
22.05 Спортлато 5 з 36, КЕНО.

БЕЛАРУСЬ 3

7.20, 12.30, 18.05, 23.35 «Калейдаскоп».
7.35 «Сусветная карцінная галерэя».
8.10, 12.45, 18.20 «Размаўляем па-беларуску».
8.15 «Яшчэ кахаю, яшчэ спадзяюся...» Меладрама.
9.35 «Вандроўка з «Бяседай».
10.30 «Айбаліт-66». Камедыя.
12.00 «Мая любая бабуля». М/ф.
12.50, 23.05 «Святло далёкай зоркі». Памяці акцёра, народнага артыста СССР Здзіслава Стомы.
13.20 Канцэрт гурта «Стары Ольса».
14.20 «У гасцях у Барыса Аверына». Сустрэча з пісьменнікам, кінасцэнарыстам, дзяржаўным дзеячам Данііла Граніным.
15.15 «Прыватнае жыццё Дон Жуана». Меладрама.
16.40 «Чароўны свет аперэты».
18.25 «Снягурка». М/ф.
19.35 «Снягурку выклікалі?» Камедыя.
20.40 «Калыханка».
21.00 «Песні навагодніх начэй». 2000-я гады.
21.30 «Прадаецца дача». Камедыя.

БЕЛАРУСЬ 5

7.45, 19.00, 23.30 PRO спорт. Навіны.
8.00, 17.20 Баскетбол. НБА. «Х'юстан» — «Атланта».
9.55 Нашы перамогі-2015. Футбол.
10.25 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Беларусь — Расія.
12.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Манчэстэр Сіці».
14.15 Спорт-мікс №14.
14.35 Спорт, спорт, спорт. Людміла Турок.
15.05 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Чэхія — Беларусь.
18.40 Козел пра футбол.
19.05 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Славакія — Фінляндыя.
21.20 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. ЗША — Швейцарыя.
23.40 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Чэхія — Беларусь.

АНТ

